# Фарміраванне маўленчай культуры вучняў IV класа шляхам асваення метапрадметных вынікаў навучання беларускай мове

У аснове паняцця "культура маўлення" ляжыць паняцце "нарматыўнасць". Пры гэтым у азначэнні "падкрэсліваецца падыход з боку аб'екта: культура (чаго?) маўлення. Пры неабходнасці падкрэсліць падыход з боку чалавека, носьбіта культуры, прынята выкарыстоўваць сумежны тэрмін "маўленчая культура (чыя?) асобы". У гэтым выпадку абмяркоўваецца камунікатыўная кампетэнцыя асобнага чалавека або групы асоб" [Матвеева, Т. В. Русский язык, культура речи, стилистика, риторика. — М., 2003. — С. 123]. Прапанаваныя дыдактычныя матэрыялы прадугледжваюць фарміраванне ў вучняў моўнай, маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый і не толькі дазваляюць назапашваць прадметныя веды, адпрацоўваць моўныя, маўленча-камунікатыўныя ўменні, але і ствараюць умовы для дасягнення навучэнцамі метапрадметных вынікаў падчас вывучэння беларускай мовы.

Дыдактычныя матэрыялы з'яўляюцца дадатковым кампанентам ВМК па беларускай мове для IV класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання і складаюцца з набору практыкаванняў, структураваных па раздзелах "Прыметнік", "Займеннік", "Дзеяслоў", "Прыслоўе". Кожны раздзел размеркаваны па тэмах.

Заданні накіраваны на выпрацоўку ў вучняў навыкаў і ўменняў:

- асэнсавана чытаць тэксты;
- працаваць са схемамі і мадэлямі;
- прымаць мэты і задачы вучэбнай дзейнасці;
- шукаць інфармацыю рознымі спосабамі;
- выконваць заданні творчага і пошукавага характару;
- вызначаць найбольш эфектыўныя спосабы дасягнення вынікаў;
- разумець прычыны паспяховасці ці непаспяховасці сваёй вучэбнай дзейнасці;
- будаваць разважанні на аснове разумовых аперацый параўнання, аналізу, абагульнення, класіфікацыі;
- выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для рашэння камунікатыўных і пазнавальных задач;
- планаваць, кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні.

Прывядзём прыклады заданняў, накіраваных на авалоданне чацвёртакласнікамі дадзенымі ўменнямі і навыкамі маўленча-моўнай дзейнасці.

**Асэнсаванае чытанне**

📖 Прачытайце тэксты.

☐ Адбылося гэта ранняй вясной. Як толькі прыгрэла сонейка, цёмныя шышкі на лясной сасне змяніліся. Іх лускавінкі пацягнуліся да сонца. У глыбіні шышкі можна было ўбачыць маленькія чорныя зернейкі. Яны мелі празрыстыя крыльцы.
Раптам адно цікаўнае зернейка выпырхнула на волю. За ім пачалі выскокваць новыя зернейкі. Што тады пачалося! Ласкавы ветрык падхопліваў іх і веерам рассыпаў у паветры.

*Паводле А. Бутэвіча.*

☐ Сасна — вечназялёнае дрэва вышынёй да 20—50 м. Таўшчыня ствала да 150 см. Каранёвая сістэма моцна развітая. Крона

маладых дрэў паўшарападобная. Ствол прамы, гладкі, кара лушчыцца. Ігліца доўгая і вузкая, у пучках, захоўваецца 2—3 гады. Шышкі дравяністыя, складаюцца з тоўстых насенных лускавінак. Насенне арэшкападобнае, звычайна з крыльцам, разносіцца ветрам.

а) Запішыце, якой тэмай аб'яднаны тэксты.

___

б) Зафарбуйце **жоўтым** колерам квадрацік побач з тэкстам-апісаннем, **зялёным** колерам — побач з тэкстам-апавяданнем.

в) Адзначце літарай **"М"** у квадрацік той тэкст, які можна сустрэць у мастацкай кнізе.

г) Падкрэсліце ў абодвух тэкстах прыметнікі, якія дапамагаюць апісаць шышкі і зернейкі сасны. Вызначце іх лік, склон і род (калі гэта магчыма).

д) Адзначце літарай **"П"** у квадрацік той тэкст, у якім усе гэтыя прыметнікі ўжыты ў прамым значэнні.

### Уменне прымаць мэты і задачы вучэбнай дзейнасці

📖 Прачытайце тэкст. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

**Бярозка**

У шчылінку паміж дошкамі мосціка прабілася **бярозка**. ___ цягнулася да сонца і шапацела зялёным лісцейкам. **Людзі** шкадавалі бярозку. ___ стараліся не зачапіць дрэўца.

Кожны раз **Міколка** падыходзіў да мосціка з хваляваннем. Аднойчы __ выкапаў бярозку і пасадзіў каля дарогі. Цяпер ___ ўжо вялікая.

*Паводле М. Янчанкі.*

*Словы для даведкі:* яна, ён, яны.

### Планаванне вучэбных дзеянняў

📖 Запоўніце табліцу наступнымі спалучэннямі слоў, дапісваючы канчаткі прыметнікаў.

Цёпл.. раніца, цёпл.. малако; вялік.. радасць, вялік.. дрэва; сін.. паліто, сін.. кветка; апошн.. цукерка, апошн.. заданне.

| Жаночы род | Ніякі род |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

Вызначце паслядоўнасць сваіх дзеянняў: расстаўце лічбы ад 1 да 4 у квадратах.

☐ Вызначаю род назоўніка, з якім звязаны прыметнік.

☐ Устанаўліваю адпаведнасць паміж канчаткам пытання і канчаткам прыметніка.

☐ Дапісваю патрэбны канчатак прыметніка.

☐ Стаўлю пытанне ад назоўніка да прыметніка.

### Кантроль і ацэнка вучэбных дзеянняў

📖 Настаўніца папрасіла вучняў прачытаць некалькі радоў слоў і здагадацца, як словы кожнага рада звязаны паміж сабой. Потым яна прапанавала дапоўніць кожны рад слоў сваімі прыкладамі. Праверце, ці правільна вучаніца выканала заданне.

а) ісці — ідуць, везці — вязуць, несці — нясуць, класці — ***кладуць***

___

б) ходзяць, носяць, возяць, ***лічыць***

___

в) лічу, лічыш, лічыць, лічым, лічыце, ***лічаць***

___

Калі знойдзеце недакладнасці, запішыце, у чым яны заключаюцца. Выправіце памылкі.

### Праца з мадэлямі і схемамі

📖 Вызначце, да якой часціны мовы адносяцца словы кожнай групы.

а) казка, вечар, свята — ___

б) навагодні, зімні, цудоўны — ___

Складзіце з гэтых слоў спалучэнні па схеме. Запішыце, абазначце канчаткі прыметнікаў.

прым. + наз.

___

___

___

Колькі спалучэнняў можна скласці з шасці прапанаваных слоў? Чаму?

___

### Пошук інфармацыі рознымі спосабамі

📖 У Мікіты дома на паліцы стаяць чатыры слоўнікі: арфаграфічны, беларуска-рускі, руска-беларускі, тлумачальны.

Падкажыце хлопчыку, які слоўнік можна выкарыстаць у залежнасці ад сітуацыі. Запішыце адпаведныя назвы слоўнікаў.

1) Мікіта піша сачыненне. Ён хоча выкарыстаць слова *пясчаны*, але не памятае яго правапіс. Да якога слоўніка яму трэба звярнуцца?

___

2) У дамашнім практыкаванні Мікіце трэба было перакласці спалучэнні слоў з рускай мовы на беларускую мову. Хлопчык не ведаў, як перакласці спалучэнні *благое дело*, *плохой поступок*. Да якога слоўніка яму трэба звярнуцца?

___

Перакладзіце выдзеленыя спалучэнні на беларускую мову. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам. Вызначце род і лік прыметнікаў.

______________________________

3) Маленькая сястрычка Мікіты толькі пачала вывучаць беларускую мову. Яна пачула выраз *пакаёвая расліна* і не зразумела яго. "Перакладзі, калі ласка", — папрасіла яна брата. Мікіта адразу пераклаў на рускую мову слова *расліна*, але не змог перакласці слова *пакаёвая*. Да якога слоўніка яму трэба звярнуцца?

______________________________

Перакладзіце гэта спалучэнне на рускую мову. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікам. Вызначце род і лік прыметнікаў у рускім і беларускім спалучэннях слоў. Чаму род прыметнікаў адрозніваецца?

______________________________

**Заданні творчага і пошукавага характару**

Адгадайце назоўнікі ў кожнай групе прыказак. Запішыце іх у правым слупку.

1. **Яна** нікога не крыўдзіць. **Яна** чалавека трымае і ўзбагачае, а гультайства псуе. Дзе шчырая **яна**, там густа, а дзе лянота, там пуста. __________
2. **Ён** — найлепшае багацце. **Ён** не кулеш, у галаву не ўвальеш. Які **ён** — такая і гаворка. __________
3. Ласкавае **яно** — што дзень ясны. Рана загоіцца, а злое **яно** ніколі. Добрае **яно** не забываецца. __________

Вусна дапоўніце прыказкі патрэбнымі назоўнікамі. Чаму так гавораць?

**Вызначэнне найбольш эфектыўных спосабаў дасягнення вынікаў**

Вучням прапанавалі запоўніць табліцу наступнымі сказамі:

Хлопчык думаў. Дзяўчынка думала. Дзіця думала. Надышла вясна. Надышло лета. Надышоў вечар. Пісьмо прыйшло. Цягнік прыйшоў. Бабуля прыйшла. Птушаня пішчала. Мышка пішчала. Чайнік пішчаў.

| Сказы з дзеясловамі ў форме прошлага часу адзіночнага ліку | | |
|---|---|---|
| ж. р. | н. р. | м. р. |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

Прачытайце, як выконвалі заданне вучні.

***Таня.*** Я спачатку выпісала ў трэці слупок сказы, у якіх дзеясловы маюць суфікс прошлага часу -**ў**. Сярод астатніх сказаў я знайшла тыя, у якіх назоўнік ужыты ў форме жаночага роду, і выпісала іх у першы слупок. Астатнія спалучэнні слоў я запісала ў другі слупок.

***Васіль.*** Спачатку я вызначыў род назоўніка ў першым сказе. Паколькі дзеяслоў мае тую ж форму роду, што і назоўнік, з якім ён спалучаецца, я запісаў гэтае спалучэнне ў трэці слупок. Такую ж працу я правёў з астатнімі сказамі і размеркаваў іх у адпаведныя слупкі.

Чый спосаб працы здаецца вам больш рацыянальным? Патлумачце чаму.

______________________________

______________________________

**Вызначэнне прычын паспяховасці ці непаспяховасці сваёй вучэбнай дзейнасці**

У працах вучняў сустрэліся памылкі. Вызначце, чаму яны ўзніклі. Дайце патрэбную параду кожнаму вучню, каб наступны раз такая памылка не паўтаралася.

| Зробленыя памылкі | Прычына | Што трэба зрабіць, каб папярэдзіць памылку |
|---|---|---|
| сінія чарніла<br>белай крупы | | |
| доўгая цень<br>моцная боль | | |
| прыгожая подпіс<br>вялікая сабака | | |

**Пабудова разважанняў**

Прачытайце сказы:

Вецер падхапіў насенне вольхі і закруціў ____ ў паветры. Вучні сустрэлі настаўніка і запыталіся ў ______ пра вынікі спаборніцтваў.

Адзначце правільнае сцвярджэнне і дапішыце ход сваіх разважанняў.

Сказы трэба дапоўніць:

☐ аднолькавай формай займенніка, паколькі ____
______________________________

☐ рознымі формамі займенніка, паколькі ______
______________________________

**Выкарыстанне маўленчых сродкаў для рашэння камунікатыўных і пазнаваўчых задач**

Увяціце, што вы забылі ў школе сумку са спартыўным абуткам, і вярнуліся, каб запы-

тацца пра яе ў вахцёра. Дапоўніце размову з вахцёрам патрэбнымі словамі і сказамі. Выкарыстайце малюнкі сумкі і спартыўнага абутку.



**Ты.** Прабачце, ці не знаходзілі вы ў гардэробе ____________ сумку?

**Вахцёр.** У гардэробе засталося некалькі сумак. Якога колеру твая?

**Ты.** ________________________

________________________.

**Вахцёр.** А што ляжыць у тваёй сумцы?



**Ты.** ________________________

________________________

**Вахцёр.** Як выглядае твой абутак?

**Ты.** ________________________

________________________.

Падкрэсліце прыметнікі, без якіх немагчыма было б апісаць сумку і абутак. Вызначце род, лік і склон гэтых прыметнікаў.

Пабудова маўленчых выказванняў

Прачытайце аб'яву.

> **Аб'ява**
> Згубілася кацяня. Тэлефануйце па нумары 8-017-29-08-917.

Ці дапаможа такая аб'ява знайсці кацяня? ________

Перапішыце аб'яву так, каб яна дапамагла ў пошуках кацяняці. Выкарыстайце пры неабходнасці фотаздымак кацяняці і спалучэнні слоў для даведкі.

________________________

________________________

________________________

________________________

________________________

________________________

________________________

________________________

________________________



*Словы для даведкі:* блакітныя вочкі, цёмны кончык хваста, рыжаваты колер, цёмныя палоскі, белая грудка, маленькае кацяня.

Вызначце род, лік і склон прыметнікаў, ужытых у аб'яве.

**Развіццё разумовых аперацый параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі**

Размяркуйце словы на дзве групы. Укажыце прымету, па якой былі згрупаваны словы.

Ідзём, кормім, выбіраем, ходзім, рэжам, носім, бяром, крычым, маўчым, слухаем.

| | |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| *дзеясловы* __________ | *дзеясловы* __________ |

Дыдактычныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў працэсе вывучэння адпаведных тэм на ўроках беларускай мовы ў IV класе, а таксама на стымулюючых і падтрымліваючых занятках. Практыкаванні выконваюцца ўсімі вучнямі класа падчас франтальнай і індывідуальнай работы. Пры неабходнасці настаўнік дае тлумачэнні па выкананні практыкаванняў тым навучэнцам, у якіх узнікаюць цяжкасці пры асэнсаванні заданняў.

Настаўніку неабходна звяртаць увагу на дынаміку развіцця адпаведных метапрадметных уменняў вучняў у ходзе ацэнкі паспяховасці выканання практыкаванняў кожнага раздзела.

**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка,
кандыдат педагагічных навук.



*На дыску — дыдактычныя матэрыялы для IV класа.*